II (РАЁННЫ) ЭТАП XXVI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ШКОЛЬНІКАЎ
ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**Комплексная работа**

**IX клас** **2009/2010 навучальны год**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Да звонкіх зычных гукаў запішыце ў квадратныя дужкі адпаведныя глухія, а да глухіх – адпаведныя звонкія.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1) [ж] – [ ]; [дз’] – [ ]; [г] – [ ]; [в] – [ ]; [д] – [ ];
2) [ф] – [ ]; [к] – [ ]; [ч] – [ ]; [п’] – [ ]; [х’] – [ ].

**Заданне 2. Прачытайце тэкст. Знайдзіце словы з арфаграфічнымі памылкамі. Выпішыце іх у табліцу і растлумачце правапіс.**

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Нядаўна яшчэ тут шумела залатым калоссем збажына, а над ёй, у шырокім блакіце неба, незмоўклымі званочкамі ліліся песні вясновых жаўрукоў.

У канцы лета жыта зжалі і па ўсім полі паставілі залацістыя сціртьі духмянай саломы.

У адно вераснёўскае ранне ўвесь ржэўнік раптам застракацеў рамонкам. Яго столькі тут закрасавала, што поле зрабілася белае.

Летам густая збажына ўсё цяпло забірала, недаючы кветкам падняць да сонца свае белыя галоўкі. Цяпер жа рамонкі дружна застракацелі на пачэрнелым ржэўніку.

| Слова з арфаграфічнай памылкай | Нарматыўнае напісанне | Правіла |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 3. Выпішыце са сказаў у табліцу абрэвіятуры. Расшыфруйце іх або падбярыце поўны сэнсавы беларускі адпаведнік. Запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1. На калегіі Мінабароны была заслухана справаздача аб рабоце ВПК. 2. Фінал вышэйшай лігі КВЗ плануецца правесці ў Мінску. 3. Сярод студэнтаў розных ВНУ можна сустрэць нямала прыхільнікаў беларускага кіно. 4. Назіранні за НЛА далі магчымасць устанавіць многа цікавых фактаў.

| № | Абрэвіятуры | Расшыфроўка або сэнсавыя беларускія адпаведнікі |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |

| | | |
|---|---|---|
| 3. | | |
| 4. | | |
| 5. | | |

**Заданне 4. Запішыце, з якім значэннем ужываюцца прыведзеныя ўстойлівыя выразы ў сучаснай моўнай практыцы.**

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Сіняя птушка | |
| 2. | Сляпое кацяня | |
| 3. | Сонная цяцера | |
| 4. | Стары воўк | |
| 5. | Стрэляная птушка | |
| 6. | Страляць з гарматы па вераб'ях | |

**Заданне 5. Запоўніце табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| 2-я асоба адз. лік | 1-я асоба мн. лік | 2-я асоба мн. лік |
|---|---|---|
| сватаешся | | |
| | | пасееце |
| | нападзём | |
| нап'ешся | | |
| | падзяўбём | |
| падарвеш | | |
| | ляцім | |
| клянешся | | |

**Заданне 6. Перакладзіце рускамоўныя словазлучэнні на беларускую мову такім чынам, каб дзеясловы ў беларускамоўных адпаведніках не паўтараліся. Запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | |
|---|---|
| устроить встречу | |
| устроить свадьбу | |
| устроить скандал | |
| устроить семейную жизнь | |
| устроить комнату | |

**Заданне 7. Прааналізуйце словы і выявіце сярод іх сінанімічныя пары. Запішыце гэтыя пары ў табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Дэфект, узор, карэкцыя, іспалін, аварыя, выстава, волат, аморфны, апафеоз, загана, грандыёзны, здарэнне, услаўленне, выслоўе, велічны, расплывісты, вернісаж, выпраўленне, афарызм, эталон.

| Сінанімічныя пары | Сінанімічныя пары |
|---|---|

| | |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 8. Трансфармуйце (перабудуйце) словазлучэнні, якія складаюцца з трох слоў, у адпаведныя па сэнсе словазлучэнні з двух слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| | |
|---|---|
| Помнік старажытнага паходжання | |
| Дзіця сямі месяцаў | |
| З'ява загадкавай прычыны | |
| Прадукцыя добрай якасці | |
| Чалавек высокага росту | |
| Алмаз двух граней | |
| Бэлька пяці метраў | |
| Аўтамабіль чырвонага колеру | |

**Заданне 9 . Сярод прыведзеных літаратуразнаўчых тэрмінаў падкрэсліце патрэбныя.**

*Максімальная колкасць балаў – 7.*

**Да тропаў адносяцца:** агнонімы, аксюмараны, эпітэты, алагізмы, параўнанні, антытэзы, сінонімы, амонімы, метаніміі, антонімы, паронімы, перыфразы, гіпербалы, гукаперайманні, метатэзы, таўталогіі, літоты, афрыкаты, асіміляцыі, працяжнікі, іроніі, каламбуры, прыдаткі, экзатызмы, эўфемізмы.

**Заданне 10. Прачытайце верш Міколы Сурначова і вызначце радкі, у якіх вучань пры перапісванні не даставіў знакаў прыпынку. Устаўце адпаведныя знакі і запішыце справа, як яны называюцца.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | |
|---|---|
| Ты мне патрэбна як глебе вада, | |
| Як мараку пах салёнага мора. | |
| Клікнуць – Не змогуць вятры перадаць; | |
| Плакаць наўзрыд – | |
| Прад бярозамі сорам; | |
| Казку прыдумваць – Не выйдзе на лад. | |
| Песню складаць – Не складаецца песня. | |
| Сон бы рукою, з павекаў зняла, – | |
| Мусіў я ночы прастойваць ля весніц. | |
| Думаў | |
| Цяжкая дарога баёў | |
| Казку юнацкага сэрца прыглушыць, | |
| Можа яе каля родных гаёў | |
| Куля праніжа ці бомба прыдушыць. | |

| | |
|---|---|
| Думкі плывуць і плывуць валакном | |
| Зноўку туды ў маю родную вёску, – | |
| Бразне галінкай бярозка ў акно, | |
| Як на цябе я гляджу на бярозку. | |

II (РАЁННЫ) ЭТАП XXVI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ШКОЛЬНІКАЎ
ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

2009/2010 навучальны год

**ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР**

**IX клас**

## Настаўніку

На роспач не маеш права,
Хаваеш слабасць і стому.
Твая нялёгкая справа
Жыццё адкрываць другому.

Любові навучыць адданай
Да роднай пявучай мовы,
Што з песні жытоў саткана,
Са звону гусляў вясновых.

Любові да роднага краю,
Да песень і казак матулі,
Сівых курганоў ля гаю,
Дзе мудрыя продкі паснулі.

У працы не маеш права:
На роспач,
на слабасць,
на стому.
Твая пачэсная справа —
Жыццё адкрываць другому.

*Алена Руцкая*

# Даведкі і каментарыі
## Камплексная работа
**IX клас** 2009/2010 навучальны год

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 6 | 5 | 6 | 4 | 5 | 5 | 4 | 7 | 5 | **52** |

**Заданне 1.**

1) [ж] – [ш]; [дз’] – [ц’]; [г] – [х]; [в] – [-]; [д] – [т];
2) [ф] – [-]; [к] – [г] (выбухны); [ч] – [дж]; [п’] – [б’]; [х’] – [г’].

**Каментарый**. За кожны правільна ўказаны або не ўказаны гук налічваецца 0,5 бала. Сярод гукаў першага рада ёсць адзін гук, які не з’яўляецца звонкім, а таму не мае пары. Гэта санорны [в]. У другім радзе гук [ф] лічыцца няпарным глухім зычным.

**Заданне 2.**

| Слова з арфаграфічнай памылкай | Нарматыўнае напісанне | Правіла |
|---|---|---|
| незмоўклымі | нязмоўклымі | У першым складзе перад націскам у словах славянскага паходжання пішацца літара *я*. |
| ржэўнік | іржэўнік | Прыстаўная літара *і* пішацца перад збегам зычных, першы з якіх *р*, калі папярэдняе слова заканчваецца на зычны гук. |
| недаючы | не даючы | Часціца *не* пішацца з дзеепрыслоўямі асобна. |
| пачэрнелым | пачарнелым | Не пад націскам у словах славянскага паходжання замест *о, э* заўсёды пішацца *а*. Правіла “*акання*”. |

**Каментарый**. За кожную правільна запоўненую клетку налічваецца 0,5 бала.

**Заданне 3.**

| № | Абрэвіятуры | Расшыфроўка або сэнсавыя беларускія адпаведнікі |
|---|---|---|
| 1. | Мінабароны | Міністэрства абароны |
| 2. | ВПК | ваенна-прамысловы комплекс |
| 3. | КВЗ | Клуб вясёлых і знаходлівых |
| 4. | ВНУ | вышэйшая навучальная ўстанова |
| 5. | НЛА | неапазна□ны лятаючы аб’ект |

**Каментарый**. За кожную правільна запоўненую клетку налічваецца 0,5 бала.

**Заданне 4.**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Сіняя птушка | *Сімвал шчасця; тое, што ўвасабляе для каго-небудзь найвышэйшае шчасце.* |
| 2. | Сляпое кацяня | *Чалавек, які не разбіраецца ў тым, што адбываецца ў наваколлі.* |
| 3. | Сонная цяцера | *Чалавек, які вельмі любіць паспаць; соня.* |
| 4. | Стары воўк | *Вельмі вопытны, спрактыкаваны чалавек.* |
| 5. | Стрэляная птушка | *Вельмі вопытны, спрактыкаваны чалавек.* |
| 6. | Страляць з гарматы па вераб’ях | *Траціць шмат сіл, сродкаў на дробязі.* |

**Заданне 5.**

| 2-я асоба адз. лік | 1-я асоба мн. лік | 2-я асоба мн. лік |
|---|---|---|
| сватаешся | сватаемся | сватаецеся |
| пасееш | пасеем | пасееце |
| нападзеш | нападзём | нападзяце |
| нап’ешся | нап’ёмся | нап’яцеся |
| падзяўбеш | падзяўбём | падзеўбяце |
| падарвеш | падарвём | падарвяце |

| | | |
|---|---|---|
| ляціш | ляцім | леціце |
| клянешся | клянёмся | кленяцеся |

**Каментарый**. За кожную правільна запоўненую клетку налічваецца 0,25 бала.

**Заданне 6.**

| | |
|---|---|
| устроить встречу | *арганізаваць (наладзіць) сустрэчу* |
| устроить свадьбу | *справіць вяселле* |
| устроить скандал | *учыніць скандал* |
| устроить семейную жизнь | *наладзіць сямейнае жыццё* |
| устроить комнату | *упарадкаваць пакой* |

**Каментарый**. За кожнае правільна перакладзенае словазлучэнне налічваецца 1 бал.

**Заданне 7.**

| Сінонімы | | Сінонімы | |
|---|---|---|---|
| Дэфект | загана | Карэкцыя | выпраўленне |
| Аварыя | здарэнне | Іспалін | волат |
| Грандыёзны | велічны | Афарызм | выслоўе |
| Апафеоз | услаўленне | Вернісаж | выстава |
| Аморфны | расплывісты | Эталон | узор |

**Каментарый**. За кожную сінанімічную пару налічваецца 0,5 бала.

**Заданне 8.**

| | |
|---|---|
| Помнік старажытнага паходжання | Старажытны помнік |
| Дзіця сямі месяцаў | Сямімесячнае дзіця |
| З’ява загадкавай прычыны | Загадкавая з’ява |
| Прадукцыя добрай якасці | Дабраякасная прадукцыя |
| Чалавек высокага росту | Высокі чалавек |
| Алмаз двух граней | Двухгранны алмаз |
| Бэлька пяці метраў | Пяціметровая бэлька |
| Аўтамабіль чырвонага колеру | Чырвоны аўтамабіль |

**Каментарый**. За кожнае словазлучэнне налічваецца 0,5 бала.

**Заданне 9.**

**Да тропаў адносяцца:** агнонімы, аксюмараны, <u>эпітэты</u>, алагізмы, алегорыі, <u>параўнанні</u>, антытэзы, сінонімы, амонімы, <u>метаніміі</u>, антонімы, паронімы, <u>перыфразы</u>, <u>гіпербалы</u>, гукаперайманні, метатэзы, таўталогіі, <u>літоты</u>, афрыкаты, асіміляцыі, працяжнікі, <u>іроніі</u>, каламбуры, прыдаткі, экзатызмы, эўфемізмы.

**Заданне 10.**

| | |
|---|---|
| Ты мне патрэбна**,** як глебе вада, | *коска* |
| Як мараку пах салёнага мора. | |
| Клікнуць**?** – Не змогуць вятры перадаць; | *пытальнік* |
| Плакаць наўзрыд**?** – | *пытальнік* |
| Прад бярозамі сорам; | |
| Казку прыдумваць**?** – Не выйдзе на лад. | *пытальнік* |
| Песню складаць**?** – Не складаецца песня. | *пытальнік* |
| Сон**,** бы рукою**,** з павекаў зняла, – | *коска* |
| Мусіў я ночы прастойваць ля весніц. | |
| Думаў**:** | *двукроп’е* |
| Цяжкая дарога баёў | |
| Казку юнацкага сэрца прыглушыць, | |
| Можа**,** яе каля родных гаёў | *коска* |
| Куля праніжа ці бомба прыдушыць. | |
| Думкі плывуць і плывуць валакном | |
| Зноўку туды**,** ў маю родную вёску, – | *коска* |

| | |
|---|---|
| Бразне галінкай бярозка ў акно, | |
| Як на цябе**,** я гляджу на бярозку. | *коска* |

**Каментарый.** 0,5 бала за кожны правільна пастаўлены і названы знак прыпынку.